View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Заяц Н.В. (Мінск)**

# “Гартаючы старонкі гісторыі...”: мастацкае асэнсаванне мінулага ў паэзіі Максіма Танка канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў

Звароты да мінулага, да постацей выбітных папярэднікаў нязменна прысутнічаюць у творчасці любога пісьменніка. У паэтычнай спадчыне Максіма Танка рэтраспекцыя выкарыстоўваецца досыць часта і выступае эфектыўным мастацкім прыёмам для выяўлення грамадзянскай пазіцыі і патрыятычнага ідэалу аўтара, яго адносін да надзённых падзей.

Народны паэт нярэдка звяртаецца да адной з самых драматычных старонак нацыянальнай гісторыі – у шэрагу позніх вершаў актуалізуюцца тэма памяці пра Вялікую Айчынную вайну і праблема паўтарэння падобных трагедый. Так, у вершы “На археалагічнай разведцы” (1986) аўтарскія асацыяцыі засноўваюцца на “гістарычным” вобразе старажытнага кургана, які выступае сімвалам вартаўніка міру, перасцерагае ад небяспекі з’яўлення новых пахавальных помнікаў. Вобраз кургана мае дачыненне да мінулага, аднак гэта не перашкаджае, а, наадварот, узмацняе футурыстычную скіраванасць твора, яго выразны антываенны пафас: “Мо лепш хай курган гэты / Аберагае далей свае скарбы / Да часу, / Калі больш не будзе / Пагрозы вайны, / Што не раз спапяляла / Мінуўшчыну нашай зямлі” [2, с. 69].

Паэт унікае эпічна разгорнутых сюжэтаў, звяртаючы ўвагу найперш на дэталі, пэўныя рэчы. Артэфакты ваенных гадоў паўстаюць у вершы “Ніхто не забыты...” (1988): “У гільзах пераржавелых / Патронаў / Крывёю напісаныя / Завяшчанні, / Забытыя ў венкаматах / Імёны” [2, с. 106]. Гэтыя сляды смерці, што і праз дзесяцігоддзі “сяўцы, следапыты” знаходзяць на “пераараных акопах”, не дазваляюць, “каб сталі праўдзівымі / Словы святыя: / «Ніхто не забыты, / Нішто не забыта...»” [2, с. 106]. Да праблемы захавання памяці пра вядомых і невядомых герояў аўтар звяртаецца і ў вершы “Перад перапісам насельніцтва” (1986). Удзячнасць і павага ўвекавечваюцца не толькі ў матэрыяльных знаках (назвы вуліц, пасёлкаў, гарадоў, Вечныя агні), але і ў яшчэ больш важных – духоўных, замацаваных у “нястомных нашых чаканнях / Іх звароту, / У імёнах іх нашчадкаў” [2, с. 65].

Гаворачы пра гістарычных асоб, Максім Танк не пераходзіць, як гэта здараецца з іншымі паэтамі, на вершаваны пераказ ключавых момантаў біяграфіі, а таксама засяроджваецца на вобразах-артэфактах, на канкрэтных рэчах – выніках чалавечай працы, якія надзяляюцца незвычайнымі, выключнымі якасцямі. Праз метафарычную характарыстыку вырабу ўскосна выказваюцца адносіны да майстра, які прэзентуецца незвычайнай, апантанай ідэяй служэння свайму краю асобай. “Гравюры Скарыны! / Ён выразаў іх / На спаконвечным / Дрэве гісторыі / Свайго народа, / Хоць мог бы падабраць / І больш падатлівы / І больш удзячны / Матэрыял. / І выразаў ён іх / Не штыхлем-разцом, / А промнем сонца. / Промнем сваёй веры / І любові да народа” [2, с. 72] (“Гравюры Скарыны”, 1987). Надзеленыя чароўнай сілай, адухоўленыя ўнікальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

энергетыкай беларускага першаасветніка, гравюры, як цудадзейныя іконы, вяртаюць сляпым зрок, “глухім – іх слых, / Няпомнячым – іх памяць, / А без’языкім – мову” [2, с. 72]. У вершы “Багрым” (1986) гісторыка-культурным артэфактам выступае выкаваная ў крошынскай кузні “люстра-цуд”. Яна “перад алтаром / Змрок будзе рассяваць святлом, / Каб лепш падслепаваты бог / Людскую крыўду ўбачыць мог” [2, с. 68]. Суровая іранічнасць аўтара, адчувальныя рэлігійны скептыцызм і богаборніцкія матывы садзейнічаюць раскрыццю рэвалюцыйна-грамадзянскага пафасу верша, падкрэсліваюць неардынарнасць не столькі жырандолі, колькі самога Багрыма.

Варта адначыць, што ў позняй лірыцы Максіма Танка вобразаў гістарычных асоб Беларусі няшмат. Думаецца, гэта абумоўлена як асаблівасцямі светапогляду і стылю мастака (сярод мноства тэм гістарычная ніколі не выступала ў авангардзе), так і жыццёвай і творчай сталасцю (арыенціры-маякі ў вобразе вядомай персоны неабходны хутчэй пачаткоўцу). Мудры чалавек, сапраўдны майстра, паэт-філосаф, Максім Танк не творыць куміраў, ён надзвычай уважлівы ў выбары герояў лірыкі. Тым больш каштоўным з’яўляецца зварот аўтара да асоб яго таленавітых сучаснікаў. У набытку мастака некалькі вершаў, прысвечаных людзям, жыццёвыя пуцявіны якіх неаддзельныя ад гістарычнага шляху Беларусі. Сваё захапленне суайчыннікамі паэт выяўляе рознымі спосабамі. Прынамсі, у адносінах да Язэпа Драздовіча Максім Танк ужывае шмат кампліментарных эпітэтаў, называючы яго “ўладаром зачараваных фарбаў, / Збіральнікам свайго народа скарбаў, / І непаўторным самавітым творцам, / Які раней за ўсіх Калумбаў свету / На многіх перагасцяваў планетах” [2, с. 283] (“Язэп Драздовіч”, 1993). Такая характарыстыка, аднак, не ўспрымаецца перабольшваннем заслуг мастака. У якасці ж артэфактаў, на якіх акцэнтуе ўвагу паэт, тут выступаюць не рукатворныя рэчы, а прыродныя з’явы, што асацыіруюцца з вечным вандроўнікам: “...Ці то пейзаж забыты, / Ці то замыславаты кій дарожны, / З біклагай ратавальнай акавіты” [2, с. 283]. Сакавітае апісанне дароў мінскай Камароўкі ў вершы “Камароўская хроніка” (1987) нечакана завяршаецца думкай пра беларускага класіка, пра яго незаменнасць і выключнасць: “Як шкада, / Што да гэтага часу / Не знайшлося нікога, / Хто мог бы прадоўжыць / Камароўскую хроніку, / Пачатую – святой памяці – / Летапісцам / Максімам Гарэцкім!” [2, с. 97]. Велічнасць і непераўзыдзенасць асобы пачынальніка нацыянальнай літаратуры падкрэсліваецца ў лаканічным вершы “Над магілай Янкі Купалы” (1993): “Нішто такім не аддаецца / Грымотным, балючым у сэрцы – / Ні хваляў марскіх вал дзевяты, / Ні гул несціханы набату, / Ні рокат падземнага грому, / Ні роў і ні стогн буралому, – / Як кінутая жменька гліны / На века тваёй дамавіны” [2, с. 285]. Форма сінтаксічнага перыяду стварае адпаведную жалобна-ўрачыстую танальнасць, узмацняе эмацыйнае і эстэтычнае ўздзеянне твора.

Мастацкі кантэнт “гістарычнай” лірыкі паэта ў апошнія гады пашыраецца за кошт новых тэм, звязаных з адкрыццём невядомых раней старонак жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

савецкага грамадства. Так, Максім Танк адным з першых увёў у сучасны літаратурны дыскурс тэму сталінкага генацыду. Верш “Курапаты” (1989) стаў пачатковай прыступкай у мастацкім асэнсаванні беларускімі пісьменнікамі рэпрэсіўнай палітыкі дзяржавы ў адносінах да народа. У параўнанні з больш маладымі калегамі, якія разглядалі Курапаты як метафару, як універсальную, сутнасную прыкмету савецкай сістэмы ўвогуле, выяўляючыі нігілістычныя адносіны да яе, Максім Танк не адмаўляе камуністычнага мінулага: “Тут расстрэльвалі / І дзяцей і бацькоў, / Нашу праўду, / Братэрскую дружбу, любоў, / Нашу мову і песні, / Што рваліся ўвысь, / Нашу будучыню, / Веру ў сацыялізм” [2, с. 163]. Канверсіі светапоглядных уяўленняў, такім чынам, не адбываецца (сталаму чалавеку складана кардынальна змяніць адносіны да рэчаіснасці). Разам з тым у вершы выяўляецца ключавая тэндэнцыя, уласцівая не толькі літаратуры, але і іншым сферам грамадскага жыцця ў так званы пераходны перыяд: кантамінацыя атэістычных (“вера ў сацыялізм”) і рэлігійных (“хто б адкуль ні прыйшоў, <...> памаліся”) каштоўнасцей.

Актуальная ў канцы 1980-х гг. праблема рэабілітацыі бязвінна асуджаных знайшла ўвасабленне ў аднайменным творы (“Рэабілітацыя”, 1989). Калі ў вершы “Багрым” гучаць матывы богаборніцтва, то тут назіраецца яшчэ большы паварот да рэлігійных асноў быцця. З’ява рэабілітацыі народа ўвасабляецца ў вобразе сельскай “цэркаўкі”: “Сягоння зноў прыбралася яна, / Як на Вялікдзень, / Уздзела крыжаносны купал, / Прытвор ачысціла / Ад гандляроў і фарысеяў / І кліча звонам багамольным / Вярнуцца / З усіх лагераў і ссылак / Сваіх дзяцей – жывых і мёртвых – / Сваіх святых, / Каб занялі належныя ім месцы / На незагоеным яшчэ / Ад тапароў і куль / Іканастасе” [2, с. 188]. Рэабілітаваная царква паўстае сімвалам духоўнасці, згуртавання народа, адраджэння забытых і занядбаных шляхоў.

З тэмай рэабілітацыі, вяртання выкрэсленых імёнаў звязана праблема перапісвання гісторыі, стварэння новага Пантэону Беларусі. Кожная дзяржаўная сістэма выхоўвае патрэбнага ёй служку шляхам духоўна-ідэалагічнага ўздзеяння. Сярод дзейсных сродкаў такой апрацоўкі – гульня з фактамі, перабольшванне або замоўчванне ролі тых ці іншых гістарычных асоб. Пра некарэктнасць і адвольнасць мастацкіх інтэрпрэтацый мінулага пісьменнікамі Маскім Танк з іроніяй гаварыў у вершы “Пахвала «гісторыі»” (1989). Сур’ёзная трывога гучыць у радках, дзе згадваецца “праца” гісторыкаў, якія ў ранг беларускіх “святых” узводзяць “і такіх, / Чые чорныя душы / Не адмыць і святой вадой / У чысціцу” [2, с. 243] (“Amicus plato...”, 1992).

Паэт адчувае асабістае судачыннене да лёсу Радзімы. Сузіраючы яе апаленую і акрываўленую мінуўшчыну, ён выказвае парадаксальную гіпотэзу: безліч трагедый роднага краю наклікалі творцы. “Знаць, не трэба было / Нам, так званым / І лірнікам, і песнярам, / Галёкаць на ўвесь свет / Аб непаўторным харастве / І незлічоных скарбах / Нашай зямлі. / Можа, не знала б яна / За свой век столькі прагнай, / Праклятай навалачы” [2, с. 112] (“Гартаючы старонкі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

гісторыі”, 1988). Развагі над незайздроснымі лёсамі саміх творцаў, складанымі перыпетыямі развіцця беларускай літаратуры ў сувязі з драматычнымі паваротамі гісторыі паслужылі асновай верша “Даведнік” (1994): “Спынены і здзіўлены / Жалобнай вокладкай, / Набыў новы даведнік: / «Беларускія пісьменнікі». / Толькі, разгарнуўшы яго / І ні да каго / Не дазваніўшыся, / Зразумеў, / Што гэта за кніга. / «Загінуў на вайне», / «У ссылцы на Сібіры», / «У Асвенціме», / «Расстраляны ў Курапатах», / «Памёр у псіхіятрычнай бальніцы», / «Паканчыў з сабой»...” [2, с. 320]. Недаглядам паэту падаецца тое, што ў гэтай “святой кнізе” ёсць імёны жывых пісьменнікаў.

Роздум над мінулым нараджае паэтычныя праекцыі ў будучыню, аднак праведзеныя гістарычныя паралелі і выяўленыя аналогіі не даюць падстаў для аптымізму. Драматызм светаадчування паэта паглыбляецца ў вершах, напісаных пасля красавіцкай трагедыі 1986 г. Нават назвы некаторых твораў гучаць як папярэджанне нацыянальнага апакаліпсісу: “Цяпер асцерагайцеся” (1989), “Тут Беларусь была” (1991). Гэтыя вершы ўяўляюць з сябе рэтраспектыўную панараму беларускай гісторыі: бясконцыя курапаты – сібіры – хатыні – трасцянцы – Чарнобыль... У храналагічным ланцугу трагедый народа пісьменніку бачыцца жахлівая тэндэнцыя – да татальнага вынішчэння і самавынішчэння Беларусі.

Народны паэт “акцэнтуе галоўныя моманты горкіх урокаў гісторыі, аглядае супярэчнасці, шматзначна прымярае іх да сучаснасці” [1, с. 339]. Гістарычная тэма ў лірыцы Максіма Танка канца 1980-х – пачатку 1990-х гг., такім чынам, раскрываецца ў сувязі з надзённымі праблемамі грамадскага жыцця, служыць для выяўлення светапоглядных каштоўнасцей аўтара.

Літаратура

1. Арочка, М.М. Максім Танк / М.М. Арочка / Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2003. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – С. 312–348.

2. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 454 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ